# СУЧАСНЫ СТАН ВЫКЛАДАННЯ І ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ НА КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ НОВАГА І НАВЕЙШАГА ЧАСУ БДУ

**Г. І. Маскевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, maskevich@bsu.by*

Артыкул прысвечаны разгляду выкладання і навуковага вывучэння пытанняў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной і захаваннем гістарычнай памяці беларускага народа, на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ у апошняе дзесяцігоддзе. Узгадваюцца імёны выкладчыкаў і навукоўцаў, якія ўнеслі уклад у распрацоўку гэтай актуальнай праблемы.

***Ключавыя словы:*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; гістарычны факультэт; кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу; Вялікая Айчынная вайна.

# СОВРЕМЕННОЕ СОСТОЯНИЕ ПРЕПОДАВАНИЯ И ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ НА КАФЕДРЕ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ НОВОГО И НОВЕЙШЕГО ВРЕМЕНИ БГУ

**А. И. Маскевич**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, maskevich@bsu.by*

Статья посвящена рассмотрению преподавания и научного изучения вопросов, связанных с Великой Отечественной войной и сохранением исторической памяти белорусского народа, на кафедре истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ в последнее десятилетие. Вспоминаются имена преподавателей и ученых, внесших вклад в разработку этой актуальной проблемы.

***Ключевые слова:*** Белорусский государственный университет; исторический факультет; кафедра истории Беларуси нового и новейшего времени; Великая Отечественная война.

# THE CURRENT STATE OF TEACHING AND STUDYING THE HISTORY OF THE GREAT PATRIOTIC WAR AT THE DEPARTMENT OF MODERN AND CONTEMPORARY HISTORY OF BELARUS OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

**A. I. Maskevich**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, maskevich@bsu.by*

The article is devoted to the teaching and scientific study of issues related to the Great Patriotic War and the preservation of the historical memory of the Belarusian people at the

Department of Modern and Contemporary History of Belarus of the BSU in the last decade. The names of teachers and scientists who contributed to the development of this urgent problem are recording.

***Keywords:*** Belarusian State University; Faculty of History; Department of the Modern and Contemporary History of Belarus; The Great Patriotic War.

Кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з'яўляецца профільнай у выкладанні перыяда айчыннай гісторыі, звязанага з Вялікай Айчыннай вайной. З часу стварэння самастойнай кафедры ў 1994 г. тэма вайны закранался ў курсах і спецкурсах, якія выкладаліся на кафедры, курсавых, дыпломных работах, магістэрскіх і кандыдацкіх дысертацыях навучэнцаў кафедры, навуковых публікацыях прафесарска-выкладчыцкага складу. Ужо больш за 30 гадоў кафедра займаецца вывучэннем і выкладаннем гэтай актуальнай да сённяшняга дня тэмы. У артыкуле размова пойдзе пераважна пра апошняе дзесяцігоддзе.

Перш за ўсё, хацелася б сказаць пра выкладчыцкую дзейнасць. Супрацоўнікі кафедры забяспечваюць выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» на большасці факультэтаў Беларускага дзржаўнага ўніверсітэта. Прыемна канстатаваць, што запатрабаванасць і зацікаўленасць у гэтым курсе на непрофільных, у тым ліку негуманітарных факультэтах апошнім часам расце. У 2015–2016 н. г. курс выкладаўся на першым курсе факультэта радыёфізікі (22 гадзіны лекцый, 12 гадзін семінарскіх заняткаў), другім курсе геаграфічнага факультэта (26 гадзін лекцый, 8 гадзін семінарскіх заняткаў), першым і другім курсах ваеннага факультэт (22 гадзіны лекцый, 10 гадзін семінарскіх заняткаў, 2 гадзіны КСР і 26 гадзін лекцыі і 8 гадзін семінарскіх заняткаў), першым і трэцім курсах фізічнага факульта (24 гадзіны лекцый, 10 гадзін семінарскіх заняткаў і 18 гадзін лекцый, 16 гадзін семінарскіх заняткаў), на завочным аддзяленні біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў у колькасці 8 гадзін (6 лекцый і 2 семінараў). У якасці формы канролю студэнты здавалі залік. У 2021–2022 н. г. некалькі змянілася структура курса. На асобных факультэтах ён увайшоў у блок спецыяльных модуляў. Пастурова пашыраліся формы самастойнай работы і праверкі ведаў студэнтаў: кантрольныя работы, рэфераты, розныя віды кіруемай самастойнай работы, эўрыстычныя заданні і інш. Першымі супрацоўнікамі кафедры, якія ўзяліся за распрацоўку і выкладанне курса, былі прафесар І. Ф. Раманоўскі, дацэнты А. Б. Багдановіч, А. Я. Верамейчык, Л. А. Осіпава, А. Ф. Паддубская, старшыя выкладчыкі Л. Ю. Казакоў, А. У. Кузняцова.

З 2022 па 2024 гг. кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу забяспечвала выкладанне на большасці факультэтаў БДУ новай вучэбнай

дысцыпліны — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». У 2024–2025 н. г. курс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» зноў стаў чытацца выкладчыкамі кафедры у якасці дысцыпліны па выбару студэнтаў. І тое, што сучасная моладзь выбірае менавіта гэты курс, з'яўляецца паказальным і ілюструе значнасць і неабходнасць захавання гістарычнай памяці беларускага народа пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Выкладанне вучэбнай дысцыпліны стала больш сістэматызаваным і цэнтралізаваным. Існуе агульная вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для ўсіх спецыяльнасцей першай ступені вышэйшай адукацыі (аўтары — прафесары А. Г. Каханоўскі, А. А. Яноўскі, дацэнт А. В. Бурачонак). Курс складаецца з 28 гадзін лекцый, 22 гадзін семінарскіх заняткаў, 4 гадзін КСР. Сёння курс выкладаюць штатныя супрацоўнікі і сумяшчальнікі кафедры дацэнты Г. С. Хадасевіч, А. М. Мох, В. В. Сяргеенкава, К. І. Козак, А. М. Кукса, старшыя выкладчыкі Н. В. Карповіч, Л. Ю. Казакоў. Яны працуюць са студэнтамі факультэта міжнародных адносін, факультэта сацыякультурных камунікацый, фізічнага, хімічнага, юрыдычнага, геаграфічнага, філалагічнага, ваеннага факультэтаў.

Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны і палітыка Рэспублікі Беларусь па захаванні гістарычнай спадчыны беларускага народа, пытанні генацыда беларускага народа з'яўляюцца часткай праграмы вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», якая выкладаецца супрацоўнікамі кафедры на ўсіх факультэтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Прафесар кафедры А. Г. Каханоўскі і дацэнт А. В. Бурачонак увайшлі ў калектыў аўтараў вучэбнага дапаможніка «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» [1].

Для студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ у разглядаемы перыяд чыталіся спецыяльныя курсы, прысвечаныя разнастайным пытанням гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Прафесар У. К. Коршук да 2019 г. год выкладаў дысцыпліну «Партызанскі рух у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». З 2020 г. дацэнт А. М. Максімчык, затым — дацэнт А. В. Лепеш для магістрантаў гістарычнага факультэта чыталі курс «Актуальныя праблемы вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі». З 2025–2026 н. г. плануецца выкладанне курса «Актуальныя праблемы інтэпрэтацыі гістарычнага мінулага і палітыка памяці ў Рэспубліцы Беларусь», значная частка якога будзе прысвечана перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

У межах вучэбнай дысцыпліны курса «Гісторыя Беларусі навейшага часу» для трэццякурснікам спецыяльнасці «Гісторыя» на вывучэнне Вялікай Айчыннай вайны адведзена 22 гадзіны (уключаючы лекцыі, семінарскія заняткі, кср). У межах курса «Гісторыя Беларусі» для студэнтаў

2 курса спецыяльнасцяў «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і «Гісторыка-архівазнаўства» адводзіцца 6 гадзін лекцый і 2 семінары.

У межах вывучаемых курсаў студэнты не проста слухаюць лекцыі, а актыўна ўключаюцца ў працу. Выкладчыкі шукаюць творчыя падыходы, выкарыстоўваюць інавацыйныя тэхналогіі ў выкладанні. Студэнты падчас і пасля вывучэння курса з гонарам і павагай да продкаў расказваюць свае сямейныя гісторыі, робяць прэзентацыі і творчыя праекты, удзельнічаюць ў грамадска-патрыятычных акцыях і навуковых мерапрыемствах, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. Дзякуючы творчым заданням нашых выкладчыкаў, некаторыя з іх упершыню даведваюцца пра гераічныя і трагічныя старонкі лёсаў сваіх продкаў. Студэнты наведаюць музеі, кіналекторыі, сустракаюцца з ветэранамі і сучаснікамі тых далёкіх падзей. Сярод музеяў, безумоўна, — Беларускі дзяржаўны Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, папулярнасцю карыстаецца Музей гісторыі беларускага кіно, дзе студэнты не толькі наведваюць экспазіцыю, але і глядзяць кіналенты, прысвечаныя ваеннай тэматыцы («Праз могілкі», «Стальная калыбель» і інш.).

Супрацоўнікі кафедры, якія актыўна задзейнічаны ў куратарскай рабоце (І. В. Лебедзева, Т. В. Лісоўская, Г. І. Маскевіч, А. Ф. Паддубская, Г. А. Страленя, Г. С. Хадасевіч), вядуць са сваімі падапечнымі студэнтамі патрыятычна-выхаваўчую работу, удзельнічаюць у рэспубліканскіх, універсітэцкіх, факультэцкіх культурна-масавых, грамадскіх мерапрыемствах, прысвечаных памятным датам Вялікай Айчыннай вайны (мітынгі, дыялогавыя пляцоўкі, форумы і інш.).

Важная частка навучальна-даследчыцкай дзейнасці кафедры — напісанне студэнтамі курсавых, дыпломных, магістэрскіх работ. Цікавасць студэнтаў да тэмы вайны ў апошнія гады расце. Выкладчыкі адзначаюць, што ўсё больш жадаючых даследаваць ваенны перыяд, даваенныя і першыя пасляваенныя гады. Няма неабходнасці упэўніваць і ўгаворваць студэнтаў — яны самі праяўляюць ініцыятыву. Сёння каля 30 % студэнцкіх работ прысвечаны тэматыцы вайны, перадваенных і першых пасляваенных гадоў. Сярод тэм — акупацыйная палітыка, сацыяльныя аспекты, сацыяльная дапамога, мабілілзацыя і эвакуацыя, розныя аспекты партызанскага руху, генацыд беларускага народа, становішча напярэданні і ў першыя пасляваенныя гады, захаванне гістарычнай памяці, у тым ліку на міжнародным узроўні.

Адзін з накірункаў работы кафедры — падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Аспірантамі кафедры пад кіраўніцтвам У. К. Коршука, П. І. Зялінскага былі падрыхтаваны кандыдацкія дысертацыі на ваенную тэматыку. Сёння аспірантамі, суіскальнікамі, дактарантамі кафедры пад

кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага, Г. І. Маскевіч, А. Ф. Паддубскай вядзецца распрацоўка актуальных пытанняў ваеннага перыяду, асобных аспектаў перадваеннага і пасляваеннага развіцця Беларусі. Сярод іх работы А. М. Мох, У. С. Калабаевай, К. А. Платонава, П. К. Харкова.

Супрацоўнікі, аспіранты, студэнты кафедры актыўна ўдзельнічаюць у навуковых мерапремствах, прысвечаных тэме Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны — канферэнцыі, круглыя сталы, дыскусіі — як у межах Рэспублікі Беларусь, так і за мяжой. У кафедры ёсць сталы досвед навуковага вывучэння праблемы. Гісторыю партызанскага руху, нацысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны закранаі ў сваёй даследчыцкай дзейнасці У. К. Коршук і І. Ф. Раманоўскі [2; 3], гісторыю БДУ у час вайны — А. І. Котаў [4, с. 5]. У апошняе дзесяцігоддзе тэме вайны былі прысвечаны асобныя навуковыя даклады і публікацыі прафесараў А. Г. Каханоўскага [5; 6], А. М. Лукашэвіча [7; 8], загадчыка кафедры Г. І. Маскевіч, дацэнтаў Т. В. Лісоўскай [9; 10; 11], В. С. Макарэвіча [12], А. Ф. Паддубскай [13], Г. С. Хадасевіч [14; 15]. Навуковыя канферэнцыі, якія амаль штогод ладзяцца кафедрай, заўсёды ўтрымліваюць секцыю, прысвечаную падзеям ваеннага ліхалецця. Сярод апошніх — «Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў новага і навейшага часу» [16], «Мадэрнізацыя і працэсы сацыяльных трансфармацый у Беларусі ў канцы XVIII–пачатку XXI стагоддзя» [17], «Новая і навейшая гісторыя Беларусі: актуальныя пытанні і напрамкі даследаванняў» і інш.

Студэнты і магістранты кафедры, якія даследуюць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, прымаюць удзел у рэспубліканскіх і міжнаролных навуковых конкурсах, дзе іх работы атрымліваюць высокія адзнакі. У 2023 г. трэццякурсніца Яна Сакавец стала ўладальнікам дыплома 1 катэгорыі XXX Рэспубліканскага конкурса студэнцкіх навуковых работ з тэмай, прысвечанай беларуска-ізраільскаму супрацоўніцтву па захаванні гістарычнай памяці пра Вялікую Айчынную вайну. З 2014 г. амаль штогод праводзіцца сумесны расійска-беларускі конкурс студэнцкіх работ па гісторыі «Общий путь к Великой Победе. Подвиг народов бессмертен». Сёння гэта мерапрыемства з шырокім колам удзельнікаў, не толькі гістарычных факультэтаў, але і іншых спецыяльнасцяў і ўніверсітэтаў. Кожны год студэнты і магістранты кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ прымаюць удзел у конкурсе і заўсёды трапляюць у лік пераможцаў, атрымліваюць спецыяльныя ўзнагароды.

Кафедра не толькі выкладае і даследуе, але і вядзе актыўную работу па папулярызацыі вывучэння і захавання гістарычнай памяці пра Вялікую Айчынную вайну за межамі Беларусі. Сёння на кафедры навучаецца магістрантка з КНР, якая піша дысертацыю на беларускай мове, прысвечаную ўдзелу ўраджэнцаў КНР у вайне на тэрыторыі Беларусі. Англамоўная

магістрантка ў сваёй магістэрскай дысертацыі даследуе гісторыю і сучаснасць Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Яшчэ адна англамоўная праца прысвечана камп'ютэрным гульням, звязаным з тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны. Працы з'яўляюцца прыкладам захавання і актуалізацыі тэмы Вялікай Айчыннай вайны сярод моладзі з дапамогай выкарыстання інавацыйных тэхналогій XXI ст.

Наш асаблівы гонар — студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя «Гісторыі Беларусі новага і навейшага часу», у вытокаў якой стаяў А. Г. Каханоўскі, зараз прафесар кафедры, дэкан гістарычнага факультэта БДУ [18]. Лабараторыяй кіравалі дацэнты У. Ф. Ладысеў, В. С. Макарэвіч. Сёння СНДЛ узначальвае дацэнт А. Ф. Паддубская. За гады свайго існавання лабараторыя каля 10 разоў была ўдастоена звання лепшай у БДУ. Лабараторыяй рэгулярна ладзяцца пасяджэнні, прысвечаныя праблематыцы Вялікай Айчыннай вайны, сустрэчы з даследчыкамі. Апошні прыклад — дзве сустрэчы з Святаславам Кулінком, намеснікам дырэктара НАРБ, які выступіў з дакладамі «Нямецкія разведвальна-дыверсійныя школы і курсы на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» і «Карныя аперацыі нацыстаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Падобныя сустрэчы заўсёды выклікаюць жывую цікавасць у студэнтаў, уздымаюць актуальныя пытанні, параджаюць актыўныя навуковыя дыскусіі.

Работа выкладчыкаў кафедры па папулярызацыі ведаў пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны не спыняецца ў межах вучэбных аўдыторый. Супрацоўнікі з'яўляюцца нярэдкімі спікерамі на інфармацыйных гадзінах і адзіных днях інфармавання ў разнастайных арганізацыях і ўстановах Мінска (факультэты БДУ, Мінскае абласное ўпраўленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, МГІРА і інш.). У якасці экспертаў выкладчыкі кафедры суправаджаюць экскурсіі, якія ладзяцца прафкамам БДУ для супрацоўнікаў універсітэта па маршрутах, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Супрацоўнікі кафедры выступаюць экспертамі і гасцямі тэлевізійных праектаў, радыёперадач, грамадскіх форумаў на інтэрнэт-пляцоўках, прысвечаных ваеннай тэматыцы. Частым удзельнікам выступленняў у сродках масавай інфармацыі, прызнаным экпертам з'яўляецца прафесар кафедры, дэкан гістарычнага факультэта А. Г. Каханоўскі. Загадчык кафедры Г. І. Маскевіч і дацэнт В. С. Макарэвіч выступалі ў маштабным дакументальным праекце БТ-1 «Палкаводцы Вялікай Перамогі. Плеяда пераможцаў», які стартаваў летам 2024 г. Неаднаразова ўдзельнічалі ў тэматычных праектах розных нацыянальных тэлеканалаў, БелТА. Загадчык кафедры прадстаўляла ўніверсітэт на прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы «Вялікая Айчынная вайна: актуальныя пытанні захавання гістарычнай памяці». У год 80-годдзя Перамогі супрацоўнікамі кафедры з дапамогай

студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў па замове Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь была распрацавана інтэлектуальная віктарына «Брэйн-рынг», прысвечаная юбілейнай даце. Г. І. Маскевіч і Г. С. Хадасевіч на працягу многіх гадоў з'яўляюцца пастаяннымі спікерамі міжнароднага маладзёжнага форума, які арганізуецца БДУ, «Святло Вялікай Перамогі». У 2025 г. у БДУ пры актыўным удзеле гістарычнага факультэта і непасрэдна дэкана прафесара А. Г. Каханоўскага, запушчаны праект «80 размоў пра Перамогу». Большая частка экспертаў праекта — супрацоўнікі і аспіранты кафедры. Дацэнт кафедры, намеснік дэкана па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце А. Е. Верамейчык выступіла адным з куратараў праекта, распавядала пра Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт ў гады ваенных выпрабаванняў і няпростае пасляваеннае аднаўленне, пра адлюстраванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў мастацтве Беларусі, Г. І. Маскевіч, Г. С. Хадасевіч расказвалі пра подзвіг і лёс жанчын на вайне і жыццё пад акупацыяй, Т. В. Лісоўская — пра рэлігійнае і духоўнае жыццё ва ўмовах ваенных выпрабаванняў, Г. А. Страленя імкнулася паказаць вайну вачамі дзяцей, выступленні К. А. Платонава былі прысвечаны ваеннай прапагандзе, У. А. Калабаевай — партызанскаму жыццю.

Сярод бліжэйшых планаў кафедры — ўдзел у сумесным адукацыйным праекце СпбДУ і БДУ, прысвечаным Вялікай Айчыннай вайне. У гэтым годзе ўпершыню па ініцыятыве кафедры і ГУН БДУ у межах штогадовай навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў БДУ на базе кафедры плануецца наладзіць работу асобнай міжфакультэцкай секцыі «80 гадоў Вялікай Перамогі: людзі, падзеі, памяць». Спадзяемся, што такая ініцыятыва стане добрай традыцыяй.

Безумоўна, кафедра — гэта не асобны арганізм, а частка агульнага калектыва. Хочацца адзначыць, што праведзеная работа магчыма дзякуючы актыўнай падтрымцы кіраўніцтва ўніверсітэта і факультэта, добраму супрацоўніцтву і падтрымцы кафедр гістарычнага факультэта, у першую чаргу кафедры крыніцазнаўства і кафедры гісторыі Расіі. Дацэнты-сумяшчальнікі кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу К. І. Козак і В. В. Сяргеенкава выкладаюць курс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)». Кузьма Іванавіч з'яўляецца частым госцем тэле- і радыёпраектаў, навуковых і грамадска-патрыятычных мерапрыемстваў, прысвечаных гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, праводзіць экскурсіі па месцах памяці. Вера Васільеўна ініцыіравала выданне электроннага зборніка студэнцкіх работ «Вспомним всех: студенты Белорусского государственного университета о Великой Отечественной войне (к 80-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков)» [19]. Студэнты і магістранты БДУ прадставілі матэрыялы пра сваіх продкаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і свае разважанні

пра значнасць захавання гістарычнай памяці. Зборнік стаў пераможцам «Усерасійскага конкурса лепшых практык захавання гістарычнай памяці» ў намінацыі «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнтаў».

Работа кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ па выкладанні, вывучэнні і папулярызацыі ведаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, захаванні гістарычнай памяці пра падзеі тых гераічных і трагічных гадоў, вядзецца у межах агульнадзяржаўнай палітыкі і тых прыярытэтаў, якія сёння стаяць перад айчыннай гістарычнай навукай.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: вучэб. дапам. / І. А. Марзалюк [і інш.]; пад агул. рэд. І. А. Марзалюка. Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2022. 446 с.

2. *Коршук В. К.*, *Романовский И. Ф.* Их детство украла война. О преступлениях фашистов на оккупированной территории Беларуси // Беларуская думка. 2018. № 1. С. 56–62.

3. *Коршук В. К.* Уничтожение гражданского населения в системе нацисткой оккупационной политики в Беларуси (1941–1944 гг.) // Сборник материалов международного симпозиума «Человечность в годы бесчеловечности: сохранение памяти о жертвах среди мирного населения в годы Второй мировой войны в советское и постсоветское время: исторический, образовательный и социально-культурный контекст», [20–22 марта 2018 г., г. Минск] / Минск. обл. исполн. ком., Междунар. обществ. объед. «Взаимопонимание», Гос. учрежд. «Гос. мемориал. комплекс „Хатынь“». Минск, 2018. С. 74–76.

4. *Каханоўскі А. Г.* Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў даследаваннях і вучэбна-выхаваўчай рабоце выкладчыкаў гістарычнага факультэта БДУ // Вялікая Айчынная вайна ў лёсе беларускага народа: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 23–24 крас. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2020. С. 3–9.

5. *Кохановский А. Г.* Великая Отечественная война в исторической памяти белорусов // Пичетовские чтения — 2020: войны в истории человечества. К 75-летию Победы над фашизмом: материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 21 окт. 2020 г. / Белорус. гос. ун-т; под общ. ред. А. Г. Кохановского. Минск: БГУ, 2020. С. 101–104.

6. *Каханоўскі А. Г.* Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў даследаваннях і вучэбна-выхаваўчай рабоце выкладчыкаў гістарычнага факультэта БДУ // Вялікая Айчынная вайна ў лёс беларускага народа: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 23–24 крас. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2020. С. 5–9.

7. *Лукашевич А. М.* Проблема интерпретации событий начального периода Второй мировой войны в белорусской учебной литературе // Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (старш.) [і інш.]. Мінск, 2019. С. 235–241.

8. *Лукашевич А. М.* Вклад белорусского народа в победу над нацистской Германией: проблемные аспекты отечественной историографии // Великий подвиг народа по защите Отечества: вехи истории. Сб. научных статей / под общей ред. С. А. Минюровой,

Ю. И. Биктуганова, М. В. Богинского. Екатеринбург: Уральский государственный педагогический университет, 2020. Т. 1., ч. 1. С. 346–355.

9. *Лисовская Т. В.*, *Яловой П. С.* Военная летопись моей семьи // Интеграция современных научных исследований в развитие общества: сборник материалов II Международной научно-практической конференции (5 мая 2017 года), Т. II. Кемерово: ЗапСибНЦ, 2017. С. 47–50.

10. *Лисовская Т. В.* Великая Отечественная война в судьбах евангельских христиан Западной Беларуси // Великая Отечественная война 1941–1945: в памяти народа, в медиапространстве и в оценках современных исследователей: сборник научных статей по материалам Всерос. науч. конф. с международным участием, посвящённой 80-летию начала Великой Отечественной войны, Пенза, 15 апреля 2021 г.; под ред. О. А. Суховой. Пенза, 2021 г. С. 101–108.

11. *Лисовская Т. В.* Сохранение памяти о Великой Отечественной войне в сознании молодежи и цифровом пространстве // Находки семейных архивов: статьи и рассказы / Авт. сост. д. и. н., проф. И. Маслова. Пенза–Брест: Издательство: ПГУАС, 2021. С. 11–13.

12. *Макарэвіч В. С.* Вялікая Айчынная вайна ў лёсах і навуковых даследаваннях выкладчыкаў гістарычнага факультэта БДУ // Вялікая Айчынная вайна ў лёсе беларускага народа: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 23–24 крас. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2020. С. 50–62.

13. *Паддубская А. Ф.* Хрысціянскія партыі Італіі на заключным этапе Другой сусветнай вайны // Thesaurus. № VI. Магілёў: МІ МУС, 2019. С. 174–182.

14. *Хадасевич А. С.* Состояние высшей школы Беларуси в годы Великой Отечественной Войны // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 8 крас. 2017 г. Вып. 16 / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. Мінск: МДЛУ, 2018. С. 178–184.

15. *Хадасевич А. С.* Белорусский государственный университет в годы Великой Отечественной войны // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 5 красавіка 2019 г. Вып. 18 / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў [нам. адк. рэд.] і інш. Мінск: МДЛУ, 2020. С. 109–114.

16. Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (старш.) [і інш.]. Мінск, 2019. 355 с.

17. Мадэрнізацыя і працэсы сацыяльных трансфармацый у Беларусі ў канцы XVIII−пачатку XXI стагоддзя: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 27 лістап. 2023 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2023. 343 с.

18. *Маскевіч Г. І.*, *Макарэвіч В. С.* Фарміраванне традыцый навуковай школы сацыяльнай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу // Беларускі гістарычны часопіс. 2024. № 12. С. 44–50.

19. Вспомним всех: студенты Белорусского государственного университета о Великой Отечественной войне (к 80-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков) / БГУ, Исторический фак.; [редкол.: В. В. Сергеенкова (отв. ред.), О. А. Яновский (отв. ред.) и др.]. Минск: БГУ, 2024. 284 с.: фото. URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/311734.